ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!



# Гомельскі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 32 (668) | Аўторак, 17 лістапада 1987 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

*Падведзены вынікі працоўнага семестра-87*

## СЯРОД ПЕРАМОЖЦАЎ

Прэзідыум абласнога савета прафсаюзаў і бюро абкома ЛКСМ Беларусі разгледзелі вынікі абласнога сацыялістычнага спаборніцтва сярод райкомаў, гаркомаў камсамола, занальных зводных і лінейных студэнцкіх атрадаў у працоўным семестры 1987 года.

Зводнаму атраду нашага універсітэта прысуджана трэцяе месца. Ён узнагароджаны Ганаровай граматай з выдачай грашовай прэміі ў памеры 250 рублёў.

Ганаровымі граматамі абкома ЛКСМБ узнагароджаны лінейныя студэнцкія атрады, якія дасягнулі лепшых вынікаў па асобных напрамках вытворчай і грамадскай работы. Сярод іх атрады: **«Волаты»** (камандзір В. Краўчанка, камісар В. Андрэявец) эканамічнага факультэта, **«Камп'ютэр»** (камандзір В. Карака) фізічнага факультэта, зводнага інтэратрада **«Фатон»** (камандзір В. Палевікоў, камісар А. Карпаў), **«Памяць»** (камандзір С. Водчыц, камісар В. Плашкоў) біяфака, якія дасягнулі лепшых вынікаў сярод атрадаў адпаведна вытворчага, навукова-вытворчага, інтэрнацыянальнага напрамкаў. Апошні з названых атрадаў прызнаны лепшым у рабоце па ахове, рацыянальнаму выкарыстанню і ўзнаўленню прыродных рэсурсаў. Сярод спецыялізаваных педагагічных атрадаў лепшым прызнаны СА **«Прамень»** з матэматычнага факультэта (камандзір Н. Агеева, камісар В. Ляўчук).

## УЗНАГАРОДЖАНЫ МЕДАЛЯМІ «ВЕТЭРАН ПРАЦЫ»

За шматгадовую добрасумленную працу ад імя Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР медалём «Ветэран працы» узнагароджаны:

АКУЛІЧ Мікалай Уладзіміравіч — дацэнт кафедры эканомікі працы.

АЛЕЙНІК Юлія Дзмітрыеўна — кіраўнік вытворчай практыкі.

БЕКАРЭВІЧ Аляксей Нікіфаравіч — дацэнт кафедры матэматычнага аналізу.

ГУРЭВІЧ Нэлі Абрамаўна — загадчыца аддзела бібліятэкі.

ГУСЕВА Маргарыта Васільеўна — асістэнт кафедры гісторыі СССР і БССР.

ЗАЙЦАЎ Барыс Макаравіч — дэкан факультэта фізічнага выхавання.

КАСЦЮЧЭНКАВА Валянціна Малахаўна — загадчыца бібліятэкі.

ЛЕВІНА Нехама Шмеркаўна — швейцар вучэбнага корпуса № 1.

РУДЗІНСКАЯ Марыя Фёдараўна — старшая выкладчыца кафедры нямецкай і французскай моў.

САВЕНКА Анатоль Міхайлавіч — старшы выкладчык кафедры лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту.

ТРУСАВА Нэлі Сцяпанаўна — асістэнт кафедры алгебры і геаметрыі.

ФРЫДМАН Генрых Аронавіч — дацэнт кафедры тэорыі імавернасцей і матэматычнай статыстыкі.

ХАДАЛЕВІЧ Ірына Васільеўна — дацэнт кафедры грамадзянскай абароны і медпадрыхтоўкі.

ХІЛЬКЕВІЧ Васіль Аляксандравіч — дацэнт кафедры батанікі і фізіялогіі раслін.

ШАЎЧЭНКА Уладзімір Аляксандравіч — прарэктар па капітальнаму будаўніцтву.

ЯЗЭПАВА Тамара Ігнатаўна — дацэнт кафедры гісторыі КПСС.

## БОЛЬШ БАЯВІТАСЦІ І КАНКРЭТНАСЦІ

### ПАТРАБУЕ ЧАС ПЕРАБУДОВЫ

Завяршыліся справаздачы і выбары ў камсамольскіх арганізацыях нашага універсітэта. Асаблівую значнасць надавала ім тое, што праходзілі яны пасля XX з'езда ВЛКСМ, напярэдадні слаўнага 70-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, у перыяд, калі перабудова закранула ўсе бакі нашага жыцця. Цяперашняя справаздачна-выбарная кампанія павінна была адрознівацца ад папярэдніх тым, каб усе камсамольскія сходы напоўніліся палітычным зместам, дапамаглі моладзі ўсвядоміць у поўнай меры сваю адказнасць за сцвярджэнне новага аблічча савецкага ладу.

XX з'езд ВЛКСМ запатрабаваў ад кожнага камсамольца актыўнай жыццёвай пазіцыі, добрай вучобы і стараннай працы, пошукаў новых, цікавых форм работы, актыўнага іх укаранення ў практыку. Аднак за час, які прайшоў пасля XX з'езда ВЛКСМ, істотных змен у рабоце камсамольскіх арганізацый ГДУ не адбылося. Непрыкметна было гарачага асабістага жадання кожнага члена ВЛКСМ пазбаўляцца ад старых звычак. Таму не для ўсіх камітэтаў камсамола і камсамольскіх бюро факультэтаў выбары сталі строгім экзаменам на баявітасць. Літаральна на ўсіх факультэтах першая частка сходаў, гэта значыць справаздачы камітэтаў камсамола і камсамольскіх бюро, праходзіла скавана, інертна. У асноўным давалі справаздачу, выступалі кіруючыя камсамольскія работнікі, а радавыя члены ВЛКСМ за рэдкім выключэннем падыходзілі да мікрафона. Ды і справаздачныя даклады важакоў камсамольскіх арганізацый не ўтрымлівалі глыбокага аналізу становішча спраў.

Вучоба была і застаецца галоўным абавязкам студэнтаў. На жаль, у дакладах не было дадзена прынцыповай ацэнкі фактам безадказных адносін многіх камсамольцаў да свайго галоўнага абавязку. Як вядома, цяпер не даецца ніякай паблажлівасці тым, хто мае запазычанасці пасля экзаменацыйных сесій. Хто не ліквідоўвае іх ў вызначаны тэрмін, таму даводзіцца развітвацца з універсітэтам. Так, у бягучым навучальным годзе адлічаны 16 чалавек з гісторыка-філалагічнага, 13 — з матэматычнага, 4 — з фізічнага, 7—з эканамічнага факультэтаў. Факты трывожныя. А пра іх у справаздачных дакладах — ні слова. Не ўсё яшчэ ў парадку ў некаторых камсамольскіх арганізацыях з маральным абліччам студэнтаў. Нярэдкія выпадкі п'янства сярод іх, іншых негатыўных з'яў. Сёлета адлічаны з універсітэта за амаральныя паводзіны студэнт факультэта фізічнага выхавання В. Вялікаборац і Ж. Навумовіч з фізічнага факультэта. Зноў жа на справаздачных камсамольскіх сходах аб такіх выпадках сакратары прамаўчалі.

Вельмі мала было ў выступленнях на сходах дакладных адрасоў крытыкі і канкрэтных прапаноў. Для камсамольцаў не стаў галоўным прынцып, выказаны на XX з'ездзе ВЛКСМ: «Крытыкуеш — прапаноўвай, прапаноўваеш — дзейнічай!».

Часта ў размовах паміж сабой студэнты закранаюць праблемы, якія іх хвалююць: вялікую загружанасць вучэбнымі заняткамі, накладкі масавых мерапрыемстваў на вучэбны працэс і інш. Аднак размовы гэтыя яны не вынеслі на справаздачныя сходы, не падышлі да мікрафона, каб выказаць тое, што іх хвалюе.

Што ж датычыць выбараў камсамольскіх важакоў, трэба адзначыць, што ва ўмовах перабудовы, дэмакратызацыі і галоснасці на такіх факультэтах як фізічны, гісторыка-філалагічны і матэматычны адбыліся прыкметныя змены па падбору і расстаноўцы камсамольскіх кадраў. Для камсамольскіх арганізацый гэтых факультэтаў прынцыпамі падбору важакоў сталі не анкетныя даныя, а іх дзелавыя якасці. Вельмі хацелася б, каб такія лідэры змаглі павесці за сабой камсамольцаў на новыя і цікавыя справы і здзяйсненні.

* * *

Сакратарамі камітэтаў камсамола гісторыка-філалагічнага, эканамічнага, матэматычнага факультэтаў выбраны **В. Дамасканаў, Г. Матаранка, С. Міхайлава**; сакратарамі камсамольскіх бюро біяфака, геафака, фізічнага факультэта і факультэта фізвыхавання — **А. Саварын, С. Коваль, У. Марчанка, С. Смірноў.**

**М. ЖУКЕВІЧ,**
**нам. сакратара камітэта ЛКСМБ ГДУ па ідэалагічнай рабоце.**

## УПЕРШЫНЮ ВА УНІВЕРСІТЭЦЕ

Распрацаваная дацэнтам кафедры фізікі цвёрдага цела І. М. Мельнічэнкам і старшым навуковым супрацоўнікам праблемнай навукова-даследчай лабараторыі фізіка-хімічных працэсаў трэння М. І. Кузьмянковым антыфрыкцыйная металапланіруючая змазка павышае механічную хуткасць бурэння, праходкі і іншыя паказчыкі ў параўнанні з зарубежным аналагам. Вынаходніцтва абаронена аўтарскім пасведчаннем і ўкаранёна на прадпрыемствах трэста «Белнафтагазразведка» з эканамічным эфектам звыш 170 тыс. руб.

Рэальны ўклад вынаходнікаў ГДУ ў паскарэнне эканамічнага развіцця краіны адзначан уручэннем ім у канцы мінулага месяца г. г. нагруднага знака «Вынаходнік СССР». Ён выдаецца разам з аўтарскім пасведчаннем на вынаходніцтва, выкарыстанае ў народнай гаспадарцы. Трэба адзначыць, што гэты нагрудны знак атрыманы ў нашым універсітэце ўпершыню.

**М. ЯРМАЛКЕВІЧ,**
**ст. інжынер патэнтнай групы.**

## «УСЕ МУЗЫ Ў ГОСЦІ ДА НАС»

20-га лістапада на сцэне Палаца культуры і тэхнікі чыгуначнікаў імя У. І. Леніна адкрываецца Усесаюзны фестываль «Беларуская музычная восень». Тут выступіць з шырокай праграмай праслаўлены калектыў Краснаярскага дзяржаўнага танца Сібіры — лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола, лаўрэат усесаюзных і міжнародных конкурсаў. На працягу 27 гадоў кіруе гэтым ансамблем таленавіты пастаноўшчык і балетмайстар Герой Сацыялістычнай Працы, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, народны артыст СССР М. Гадэнка.

На канцэртных пляцоўках нашага горада ў дні фестывалю выступяць таксама Маскоўскі камерны хор пад кіраўніцтвам народнага артыста СССР, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР прафесара В. Мініна, Дзяржаўны камерны хор пад кіраўніцтвам лаўрэата міжнароднага конкурса В. Палянскага.

У рамках Усесаюзнага фестывалю «Беларуская музычная восень» у горадзе над Сожам выступяць артысты Балгарыі, Свярдлоўскай абласной філармоніі, Ленінграда, Латвійскай ССР.

Аб праграме фестывалю шырока апавяшчаюць канцэртныя афішы. Шчыра запрашаем вас, дарагія таварышы, стаць актыўнымі ўдзельнікамі гэтага традыцыйнага вялікага культурнага свята.

**Л. БАЛАЖ,**
**рэдактар Гомельскай абласной філармоніі.**



Практычныя заняткі ў лабараторыях адкрываюць перад першакурснікамі цікавы свет нязведанага.

НА ЗДЫМКУ: студэнткі гр. Б-13 біялагічнага факультэта Н. Сідарковіч і В. Асянкіна на занятках па хіміі.

Фота А. Ульянкінай.

## ВІНШУЕМ!

Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат эканамічнага факультэта, кафедра тэхнічных сродкаў апрацоўкі эканамічнай інфармацыі горача віншуюць асістэнта кафедры ТСАЭІ ЖУЛЬКОВА Віктара Іванавіча з зацвярджэннем яго ВАКам у вучонай ступені кандыдата тэхнічных навук.

* * *

Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат матэматычнага факультэта, кафедра матаналізу горача віншуюць асістэнта гэтай кафедры МІРОЦІНА Адольфа Рувімавіча з зацвярджэннем яго ВАКам у вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.

## СЁННЯ—МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ СТУДЭНТАЎ

# З'ЯДНАНЫ АДНЫМІ ІМКНЕННЯМІ

17 ЛІСТАПАДА адзначаецца адно з самых вялікіх свят моладзі ўсіх краін свету — Міжнародны дзень студэнтаў. Разам са сваімі савецкімі сябрамі гэтую падзею адзначаюць і замежныя студэнты нашага універсітэта — больш сарака чалавек з 16 краін Азіі і Афрыкі. Сёлета іх дружная сям'я папоўнілася прадстаўнікамі Індыі, Афганістана, Эфіопіі, Іарданіі, Марока, Алжыра, Сірыі і Гвінеі-Бісау. З кожным годам паняцце «інтэрнацыяналізм» набывае ў нас больш канкрэтны змест, атаясамліваецца з рэальнай, паўсядзённай работай. Тыдзень назад, калі адзначаўся Сусветны дзень моладзі, у перадачы абласнога радыё прагучала інтэрв'ю з Нік Мухамедам — філолагам-першакурснікам з Афганістана. «Я хачу, — сказаў Мухамед, — каб маладыя людзі ўсіх краін свету працягвалі адзін да аднаго рукі дружбы. Тады не будзе войнаў і разбурэнняў, будзе — мір». Вядома, гэта — галоўная думка, запаветная мара ўсіх людзей добрай волі. Аб міры і шчасці, дружбе і міжнародным супрацоўніцтве мараць замежныя студэнты ГДУ. Яны не толькі авалодваюць неабходнымі спецыяльнымі ведамі, але і актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці, з цікавасцю знаёмяцца з нашай краінай.

Гэтым летам у ГДУ ўпершыню быў створаны «свой» інтэрнацыянальны студэнцкі будаўнічы атрад. Добрымі вынікамі ў рабоце, стараннасцю вызначыліся яго байцы Чхум Ван Чхан, Рат Тхаўро, Кхім Сарын, Сару Рат Сарвут, (Кампучыя), Бдзіра Нідаль, Нуеман Абдулрахман (Сірыя), Бары Ібраіма (Гвінея). «Дысцыплінаваныя, працавітыя рабяты, — гаворыць аб іх камандзір атрада Уладзімір Палевікоў. — І з савецкімі студэнтамі адразу пасябравалі. Нам было цікава працаваць разам». А студэнты з Гвінейскай Рэспублікі ўжо другі год вучацца ў ГДУ. 2 кастрычніка, як і летась, яны ўрачыста адзначылі сваё нацыянальнае свята — Дзень незалежнасці. У вечары інтэрнацыянальнай дружбы прыняў удзел прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар Л. А. Шамяткоў, які звярнуўся да гвінейскіх студэнтаў з прывітаннем і пажадаў ім поспехаў у вучобе.

Не так многа часу прайшло з пачатку новага навучальнага года, але мы ўжо з задавальненнем пазнаёміліся з новымі талентамі — выканаўцай індыйскіх песень і танцаў Трынай Лахіры (Індыя), спеваком і дэкламатарам Хамуш Мухамедам Імадам (Сірыя). Не засталіся незаўважанымі вакальныя здольнасці Таха Мухамеда (Сірыя) і студэнтаў з Іарданіі Марвана, Мухамеда, Халдона і Амэра. Шмат цікавага даведаліся замежныя студэнты аб гісторыі, сённяшнім дні і будучыні нашага горада ў час экскурсіі па ім. Добрыя ўражанні засталіся ў іх і ад наведвання калгаса імя У. І. Леніна. Сапраўдным акрыццём стала для іх знаёмства з музеем народнай творчасці, які знаходзіцца ў Ветцы. У бліжэйшых нашых планах — экскурсія ў г. п. Лоеў, дзе замежныя студэнты змогуць азнаёміцца з багатай музейнай экспазіцыяй, прысвечанай вызваленню Гомельшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Напярэдадні юбілею Вялікага Кастрычніка замежныя студэнты ўдзельнічалі ў вечары інтэрнацыянальнай дружбы, які адбыўся ў музычным вучылішчы імя Н. Ф. Сакалоўскага. З глыбокім хваляваннем слухалі яны выступленне ветэрана вайны, удастоенай медаля «Флорэнс Націнгейл» Марыі Апанасаўны Гарачук, якая падзялілася ўспамінамі аб незабыўных днях Вялікай Айчыннай, заклікала ўсіх змагацца за мір ва ўсім свеце. Пасля ўрачыстай часткі адбыўся канцэрт мастацкай самадзейнасці замежных студэнтаў. Асабліва спадабалася прысутным выступленне Хамуш Мухамеда Імада, які выканаў песню «Жураўлі» на словы Р. Гамзатава. Горача віталі гледачы Бдзіра Нідаля і Таха Мухамеда — выканаўцаў арабскай народнай песні «Добры вечар, сябры!». Як заўсёды, захапілі ўсіх сваім танцам кампучыйскія студэнты. Упэўнена трымаўся на сцэне вядучы канцэрта — матэматык-другакурснік Каба Юсуф (Гвінея).

Сёлетні Міжнародны дзень студэнтаў мы адзначаем разам са сваімі замежнымі сябрамі, з якімі нас аб'ядноўваюць агульныя справы і імкненні.

**Ул. КОВАЛЬ,**
**намеснік дэкана па рабоце з замежнымі студэнтамі, кандыдат філалагічных навук.**



**На сцэне актавай залы музвучылішча — Бдзіра Нідаль і Таха Мухамед — выканаўцы арабскай народнай песні «Добры вечар, сябры!».**

Фота **Л. Акінчыц.**

# Дружба, правераная часам

У гэтым годзе споўнілася 40 гадоў з таго часу, калі паміж Рэспублікай Індыяй і Савецкім Саюзам былі ўстаноўлены дыпламатычныя адносіны. А гандлёвыя і культурныя сувязі паміж нашымі краінамі маюць старажытную гісторыю. Перамога Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі адыграла вялікае значэнне для ўздыму нацыянальна-вызваленчага руху народаў Азіі, у тым ліку і Індыі. Па словах вялікага індыйскага паэта Рабіндраната Тагора, Вялікі Кастрычнік адкрыў шлях у будучыню, да якой павінна імкнуцца і Індыя. Пад уплывам Кастрычніка пачаў фарміравацца рабочы рух у Індыі, распаўсюджваліся ідэі навуковага сацыялізма. У краіне ствараюцца першыя камуністычныя арганізацыі, якія ў 1925 годзе аб'ядналіся ў Камуністычную партыю Індыі. Пасля 1947 года, калі Індыя дабілася незалежнасці, рознабаковыя сувязі паміж дзвюма краінамі значна пашырыліся. Важнай вяхой у гісторыі савецка-індыйскіх адносін стаў Дагавор аб міры, дружбе і супрацоўніцтве паміж СССР і Індыяй. «Дружба нашых народаў, — гаварыла прэм'ер-міністр Індыі Індзіра Гандзі, — вынікае з глыбокага імкнення да справядлівасці і раўнапраўя». Пачатак гэтай вялікай дружбы быў пакладзены Махатмай Гандзі. Важкі ўклад у яе ўмацаванне ўнеслі Джавахарлал Неру і Індзіра Гандзі. Зараз гэтую справу працягвае Раджыў Гандзі.

40-годдзе незалежнасці Індыі супала ў гэтым годзе са слаўнай падзеяй — 70-годдзем Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Гэтым дзвюм знамянальным падзеям прысвечаны фестываль Індыі, які зараз праходзіць па ўсяму Савецкаму Саюзу. 21 лістапада ў Індыі пачнецца фестываль Савецкага Саюза, на адкрыццё якога да нас на радзіму прыбудзе з сяброўскім візітам Старшыня Савета Міністраў СССР М. І. Рыжкоў. Фестываль пачнецца з адкрыцця ў Дэлі помніка У. І. Леніну. Ідэя гэтых фестываляў — культурнае ўзаемаўзбагачэнне, умацаванне дружбы і супрацоўніцтва.

Мы ўпэўнены, што паглыбленне і развіццё савецка-індыйскай дружбы будзе важкім укладам ва ўмацаванне міру на ўсёй Зямлі.

**Трына ЛАХІРЫ,**
**Сачын ДЖАІН,**
**студэнты 1-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта (Індыя).**

# МОВА СУПРАЦОЎНІЦТВА

Руская мова не толькі служыць сродкам міжнацыянальных адносін, гэта — адна з прызнаных міжнародных моў, мова міру і дружбы.

У Дамаску, сталіцы Сірыйскай Арабскай Рэспублікі, руская мова вывучаецца ва універсітэце і Савецкім культурным цэнтры. У гэтым цэнтры рускую мову вывучаюць тыя, хто хоча як мага больш даведацца аб жыцці савецкіх людзей, больш глыбока вывучыць гісторыю Савецкай краіны, хто марыць працягваць вучобу ў Савецкім Саюзе. Я з'яўляюся адным са шматлікіх выпускнікоў Савецкага культурнага цэнтра ў Дамаску. У час заняткаў я і мае сябры знаёміліся з рускай літаратурай і гісторыяй, многа часу аддавалі заняткам па рускай мове. Удзельнічалі мы і ў святкаванні памятных падзей у жыцці савецкага народа. Пад кіраўніцтвам савецкіх выкладчыкаў мы займаліся пастаноўкай спектакляў, чыталі вершы рускіх і савецкіх паэтаў, спявалі песні. Савецкі культурны цэнтр у Дамаску мы ўспрымалі як частку Савецкага Саюза.

Пасля двухгадовага навучання ў цэнтры я прыехаў на вучобу ў Савецкі Саюз, каб набыць спецыяльнасць выкладчыка рускай мовы і літаратуры. Думаю, што за час вучобы ў Гомельскім універсітэце я набуду трывалыя веды і стану карысным сваёй Радзіме спецыялістам.

**Мухамед Імад ХАМУШ,**
**студэнт 1-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта (Сірыя).**



**Кампучыйскія студэнты Рат Тхаўро і Чхум Ван Чхан выконваюць нацыянальны танец на вечары інтэрнацыянальнай дружбы ў музычным вучылішчы імя Н. Ф. Сакалоўскага.**

Фота **Л. Акінчыц.**



**Спявае трэцякурснік матэматычнага факультэта Нуеман Абдулрахман (Сірыя).**

Фота **Л. Акінчыц.**

## *Інтэрнат—наш родны дом*

# І СЛОВАМ, І ПЕСНЯЙ

На працягу многіх гадоў інтэрнат № 2, дзе жывуць студэнты матэматычнага факультэта, а ў апошні час і замежныя студэнты, па праву лічыцца адным з лепшых ва універсітэце. Вызначаецца ён утульнасцю і пастаянным узорным парадкам, добрым афармленнем. А яшчэ адна адметнасць у тым, што частымі гасцямі ў інтэрнаце сталі нашы выкладчыкі. З іх удзелам арганізуюцца «круглыя сталы», цікавыя вечары адпачынку, іншыя мерапрыемствы, якія не пакідаюць нікога раўнадушным.

Надоўга запамятаецца сустрэча з выкладчыкамі матэматычнага факультэта, якая адбылася ў інтэрнаце ў гонар 70-годдзя Вялікага Кастрычніка. Са слаўным юбілеем ўсіх прысутных цёпла павіншаваў дэкан М. В. Селькін. Затым завязалася ажыўленая размова аб усім тым, што хвалюе цяпер студэнтаў у перыяд перабудовы вышэйшай школы, пры ўсталяванні ў нашым жыцці сапраўднай дэмакратыі. Са сваімі выкладчыкамі мы адчувалі сябе як роўныя з роўнымі. Непрыкметна залу напоўнілі музыка, песні, загучалі паэтычныя радкі. Прарэктар універсітэта па вучэбнай рабоце Л. А. Шамяткоў нагадаў на акардэоне мелодыі песень сваіх студэнцкіх гадоў. Пад яго акампанемент спявалі песні студэнткі С. Касаева і Л. Міхаленка. Папулярныя песні Б. Акуджавы, У. Высоцкага, С. Нікіціна выканаў пад гітару загадчык кафедры тэорыі імавернасцей і матэматычнай статыстыкі Ю. У. Малінкоўскі. Свае любімыя песні выканалі таксама пяцікурсніца А. Сяменчыкава і сёлетняя выпускніца А. Радзякова, якая працуе сельскай настаўніцай на Віцебшчыне і ў святочныя дні прыехала наведаць родны факультэт.

Пранікнёна гучалі вершы і расказы, якія чыталі дацэнт Л. Я. Палякоў, с. н. с. кафедры матэматычных праблем кіравання Т. М. Парахня, камендант інтэрната А. І. Саўчанка. Неабходна зазначыць, што выканаўцы песень і чытальнікі расказвалі і аб гісторыі стварэння выкананых імі твораў.

Чарговая сустрэча з нашымі выкладчыкамі адбудзецца сёння — у Міжнародны дзень студэнтаў. Упэўнена, што і яна прынясе кожнаму ўдзельніку сапраўднае задавальненне.

**С. МІХАЙЛАВА,**
**сакратар камітэта камсамола матэматычнага факультэта.**

